

### *«Іісус ці Варава»*

***Антоній Бокун**, пастар царквы "Ян Прадвеснік"*

**2Цім.3:16-17** « *Усё Пісанне боганатхнёнае і карыснае для навучання, для выкрыцця, для выпраўлення, для настаўлення ў праведнасьці, каб быў дасканалы Божы чалавек, да ўсякае добрае справы падрыхтаваны*». Каб дасканалы быў чалавек Божы, патрэбна Біблія. Асабліва важна для нас, хрысціян веры евангельскай, жыць на аснаванні таго, што напісана ў Слове Божым. На нас глядзяць людзі, на нас глядзіць Бог! Ці сапраўды мы з'яўляемся Ягонымі людзьмі?

Звернем увагу на некалькі месц Пісання, але паглядзім на іх пад іншым кутом. **Мацьв.27:15-22** «*А на свята намесьнік меў звычай выпускаць народу аднаго вязьня, якога б хацелі. Быў тады ў іх вядомы вязень, званы Варава. І вось, як сабраліся яны, сказаў ім Пілат: каго хочаце, каб я выпусьціў вам: Вараву ці Ісуса, Якога завуць Хрыстом? Бо ведаў, што з зайздрасьці выдалі Яго. Тым часам, як сядзеў ён на судовым месцы, жонка ягоная паслала яму сказаць: не рабі нічога Праведніку Таму, бо я сёньня ў сьне шмат адцярпела за Яго. Але першасьвятары і старэйшыны падбухторылі люд прасіць Вараву, а Ісуса загубіць. Тады намесьнік сказаў у адказ: каго хочаце з двух, каб я выпусьціў вам? Яны сказалі: Вараву. Кажа ім Пілат: што ж мне зрабіць зь Ісусам, Якога завуць Хрыстом? Кажуць яму ўсе: хай будзе ўкрыжаваны!*».

Калі мы чытаем гэтыя словы, нам здаецца, як такое можа быць? Як людзі, бачыўшыя Іісуса і Ягоныя цуды, калі ім прапанавалі выбар, сказалі выпусьціць Вараву, а Іісус хай будзе ўкрыжаваны? Нам часам здаецца, што ўсё так проста. Ёсць Іісус і нейкі Варава-бандыт, а людзі не маглі разабрацца. Але ўсё не так проста, калі б мы жылі ў той час, то невядома, які б выбар зрабілі. Каго адпусціць? Іісуса, Якога завуць Хрыстом, ці Вараву? Калі дасканала разабрацца ў дакументах, то Варава не быў проста крымінальнікам. Ён прэтэндаваў на тое, што ён таксама Месія, і вызваліць Ізраіль ад нявολі Рыма. І нават яго звалі Іісус пан Абба, Іісус сын айца. І быў Іісус сын Айца, Іісус з Назарэту, якога завуць Хрыстос. І вось вывеў Пілат перад народам двух Іісусаў и спытаў: «Якога з іх вы выбераце?» І ужо ўсё зусім не так проста и адназначна. Усе ведалі, што Варава вядомы вязень, падняў паўстанне супраць Рыма. Усе чулі і пра Іісуса з Назарэта, Які рабіў цуды, але не рабіў тое, што ад Яго чакаў народ. Ён не пачаў паўстанне супраць Рыма. Калі Пілат прапанаваў, людзі былі гатовы, што іх падбухторать першасьвятары і старэйшыны. Часам і мы не можам знайсьці адказы на простыя пытанні.

Іуда Іскарыёт быў здраднікам. Ён апаганіў сваё імя. Нам здаецца, што ніколі мы не зможам зразумець гэтага. Часам мы думаем, што ніколі так не зрабілі б як ён. Мы глядзім на Іуду, як на здрадніка… Сам Іісус выбраў Іуду Іскарыёта адным з дванадцаці апосталаў. Больш таго Ён даручыў яму грошы. Абы каму грошы не давяраюць. Іуда быў секарыйцам і такім жа паўстанцам як Варава. Але ніхто не думаў, што ён будзе здраднікам. Іуда Іскарыёт быў такім жа вучнем як і астатнія, але ў яго была адна праблема, якая і зрабіла Ііду тым, кім ён стаў. Ён не хацеў служыць Госпаду, а хацеў каб Госпад служыў яму. Іуда хацеў, каб усё было так, як вырашыў ён, а не як вырашыў Госпад. І ён, як і ўсе апосталы, ійшоў за Іісусам, таму што верыў, што Ён Месія. Месія— гэта значыць Цар, Памазанец. А калі Іісус— Цар, то Яго вучні прэм'ер-міністры, і яны спрачаліля, хто з іх большы. Іуда чакаў, што Іісус падыме паўстанне супраць рымлян. Ён здрадзіў Іісусу не таму, што яму былі патрэбны грошы, а таму што, калі яны прыйшлі ў Іерусалім на Пасху, Ён нічога асобага не рабіў з таго, што чакаў Іуда. Іуда бачыў як Хрыстос рабіў цуд, як хадзіў па

вадзе, як дэманы ўцякалі, як накарміў пяццю хлябамі пяць тысяч чалавек, а тут Ісус нічога не робіць, пра што так марыў здраднік. І ён вырашыў дапамагчы, выдасці Настаўніка першасьвятарам, каб Той з'явіўся ўсім, і ўзяў самую мінімальную сумму, як за раба 30 сярэбранікаў. Ісуса арыштоўваюць, вядуць на суд, асуджаюць на смерць, але Ён нічога не робіць. І тады Іуда сам пачынае рабіць тое, што з'яўляецца прэрагатывай Божай. Сам пачынае сябе судзіць, прыбягае да першасьвятароў і кажа, што саграшыў, прадаўшы кроў нявінную і выкідвае гэтыя грошы. Але зноў пачынае лічыць сябе разумнейшым за Госпада і робіць тое, што хоча ён …

Пётр таксама не быў на высаце ў той час, хоць раней і крычаў, што не адрачэцца ніколі. Але праз гадзіну тры разы сказаў, што не ведае гэтага Чалавека. Ён спужаўся, ён ведаў ад Каго адракаецца, бо казаў: «Ты Хрыстос Сын Бога Жывога!» І Пётр здрадзіў, але не стаў судзіць сябе, а пакінуў суд Госпаду. Іуда сам вырашыў, што яму прыналежыць за гэтую здраду…

Калі мы чытаем у Бібліі пра гэтыя здрады апосталаў, пра народ Ізраільскі, які сорак год хадзіў па пустыні — гэта ўсё адносіцца да нас. Здаецца, калі я магу здрадзіць Хрысту? Калі мы хочам, каб Бог рабіў тое, што хочам мы, а не Ён, то мы становімся на шлях здрады Хрысту. Гэта вялікая спакуса і многія хрысціяне ў яе трапляюць. Мы жывем у такім свеце, дзе падаецца што Бог, гэта Той, Хто павінен нам служыць. Але не Бог нам павінен служыць, гэта кожны з нас павінен служыць Яму. Ён Госпад, Ён Валадар, а я слухаю, імкнуся разумець, спазнаць і выканаць Яго волю. Не каб Госпад згадняў волю маю: ратаваў мяне, абараняў, дабраслаўляў, даваў усё, што мне патрэбна. Ён дае нам і дабраслаўляе нас, але гэта не з'яўляецца мэтай для якой мы прыйшлі да Госпада. Мы прыйшлі да Госпада, каб служыць Яму. Скажам разам: «Ты мой Госпад! Я прыналежу Табе»!